**XIII Майскія Віткаўскія чытанні "Вяшчун дабра і справядлівасці"**



16 мая стартавалі XIII Майскія Віткоўскі чытанні "Вяшчун дабра і справядлівасці", прысвечаныя 109-й гадавіне з дня нараджэння нашага пісьменніка-земляка Васіля Віткі. Нашы даўнія сябры і партнёры з дзіцячай бібліятэкі №6 імя Васіля Віткі горада Мінска павіншавалі чытачоў і супрацоўнікаў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі з чарговым адкрыццём Чытанняў.

Форум пачаўся з паэтычнага марафону “Мілую цябе, люблю зямлю сваю – малую”, які адкрыла паэт, настаўнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Ганна Міклашэвіч. Свае відыязапісы з чытаннем твораў дзеці дасылалі на адрас бібліятэкі. З удзельнікамі можна было пазнаёміцца на сайце бібліятэкі.

Другі дзень Чытанняў быў прысвечаны часопісу “Вясёлка”, традыцыі якога заклаў Васіль Вітка, аддаўшы любімаму выданню 17 гадоў жыцця.

20 мая быў праведзены казачны сундучок “Дзіўныя казкі Васіля Віткі”.




Бібліятэкары пазнаёмілі дзяцей з кніжнай выставай “Беларускі Андэрсан”, правяла конкурс-віктарыну “Адкуль гэтыя радкі”. Школьнікі адгадвалі загадкі, чыталі вядомыя творы пісьменніка-земляка.

Гучныя чытанні "Сем урокаў мудраца» працягнулі Віткаўскі тыдзень.

Удзельнікі лялечнага гуртка “Батлейка” з Замосцкай школы падрыхтавалі літаратурную онлайн-праграму па творах Васіля Віткі, у якіх згадваецца пра самую напеўнай птушцы Беларусі – салаўя.

У краязнаўчым форуме ўзялі ўдзел бібліятэкі і школы горада і раёна, рэдакцыйная калегія часопіса “Вясёлка”, дзіцячая бібліятэка г. Мінска імя Васіля Віткі і ўсе прыхільнікі творчасці пісьменніка.

